ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (1234) ● 8 сакавіка 1979 г. Цана 2 кап.





**На здымках:** з самай раніцы на выбарчым участку № 30/77 панавала дзелавая, прыўзнятая атмасфера. Агітатары добра падрыхтаваліся да сустрэчы з выбаршчыкамі;

першы раз удзельнічае ў выбарах студэнт III курса факультэта радыёфізікі і электронікі В. Шукела;

за выбраннікаў народа аддаюць свае галасы студэнт IV курса факультэта радыёфізікі і электронікі У. Бухар і інжынер хімфака В. Рухля.

Фота **М. Дубовіка.**

## Свята сацыялістычнай дэмакратыі

Адарван яшчэ адзін лісток календара, і дзень 4 сакавіка адышоў у гісторыю. Але, бадай, іменна гэты дзень, так не падобны на многія іншыя, запомніцца назаўсёды. Асабліва памятны ён будзе для трэцякурснікаў радыёфізічнага факультэта Валодзі Шукелы, Сяргея Шумілы і яшчэ ста пяцідзесяці іх таварышаў. Памятны таму, што яны ўпершыню ў сваім жыцці аддалі свае галасы ў час выбараў у Вярхоўны Савет СССР, галасавалі за лепшых прадстаўнікоў нашага народа, галасавалі за мір, за шчасце.

У гэты нядзельны дзень рана абудзіўся інтэрнат, што знаходзіцца ў Шчамысліцах. Гасцінна расчыніў дзверы выбарчы ўчастак № 30/77. Шмат клопатаў у старшыні камісіі Валерыя Анатольевіча Чудоўскага. Хоць і многа зроблена ім і агітатарамі ў ходзе падрыхтоўкі да выбараў, але хваляванне не знікла. Вынікі агітацыйнай работы, адразу відаць, нядрэнныя. Дружна заходзяць у пакой галасавання святочна апранутыя людзі. З добрым настроем і шчырымі ўсмешкамі падыходзяць выбаршчыкі да ўрнаў і апускаюць бюлетэні. Напружана працуе выбарчая камісія. Чуецца наўкола гоман людзей, гучыць бадзёрая музыка.

Галасуюць за кандыдатаў маналітнага блоку камуністаў і беспартыйных. Гэта вялікае права — выбіраць і самому быць выбраным у орган вышэйшай улады — гарантавана кожнаму савецкаму чалавеку нашай Канстытуцыяй.

Калі пільна прыгледзецца да выбаршчыкаў, то можна беспамылкова адзначыць тых, хто ўпершыню ўзяў у рукі бюлетэні. Выгляд у навічкоў — асабліва ўрачысты, святочны. Мабыць, ад усведамлення таго, якую адказную задачу даверана ім выканаць.



Да ўрны падыходзіць інжынер кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі Валянціна Рухля. Галасуе яна не ў першы раз, але, тым не менш, абыякавай застацца ў гэты дзень немагчыма. Гэта ж і ёсць непасрэдны ўдзел у кіраванні нашай дзяржавай, тое, аб чым марыў У. І. Ленін.

Яшчэ не было і дванаццаці гадзін, а большая частка выбаршчыкаў аддала свае галасы за абраннікаў народа.

Фота М. Дубовіка.

## ПА БДУ
### Інфармацыя

У Вялікіх Луках адбыўся дзесяты злёт студэнцкіх будаўнічых атрадаў Пскоўскай вобласці, на якім прысутнічала дэлегацыя нашага універсітэта. На злёце былі падведзены вынікі працоўнага семестра 1978 года. Універсітэцкі аб'яднаны атрад заняў першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве і ўзнагароджан пераходным Чырвоным сцягам Пскоўскага абласнога Савета народных дэпутатаў, абкома прафсаюзаў і абкома камсамола. Камандзір занальнага атрада А. Г. Слука перадаў Чырвоны сцяг камітэту камсамола універсітэта.

* * *

3 сакавіка на гістарычным факультэце адбылася студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 101-й гадавіне вызвалення Балгарыі ад асманскага прыгнёту. Арганізавана яна была сумесна аддзяленнем таварыства савецка-балгарскай дружбы нашага універсітэта і зямляцтвам балгарскіх студэнтаў і аспірантаў, якія навучаюцца ў Мінску.

Адкрыў канферэнцыю прафесар Д. Б. Мельцар. «Вызваленчая вайна 1877—78 гг.» — такая тэма даклада студэнткі I курса механіка-матэматычнага факультэта М. Сафроніевай. Удзелу беларусаў у вызваленні Балгарыі ад турэцкага прыгнёту прысвяціў сваё выступленне студэнт III курса гістарычнага факультэта М. Стралец. Дружба савецкага і балгарскага народаў непарушная ў вяках — гэта думка выразна прагучала ў выступленні другакурсніцы гэтага ж факультэта Г. Банькоўскай.

**А. РУБАНАЎ.**

Адбылося сумеснае пасяджэнне прафсаюзнага актыву універсітэта і адміністрацыі студэнцкага гарадка (дырэкцыі гарадка і камендантаў інтэрнатаў).

Былі падрабязна прааналізаваны акт праверкі і пастанова групы народнага кантролю БДУ імя У. І. Леніна. Удзельнікі пасяджэння канкрэтна разабралі кожнае пытанне акта праверкі, выказалі свае думкі. Многія недахопы былі выяўлены ў палітыка-выхаваўчай рабоце са студэнтамі, у дзейнасці дырэкцыі студгарадка. Адзначаўся недастатковы ўзровень эстэтычнага афармлення інтэрнатаў БДУ. У інтэрнаце № 7, напрыклад, пустуюць холы, няўтульна ў чытальных пакоях інтэрната № 2. Указана, што недастаткова вядзецца работа са студэнтамі па беражлівых адносінах да грамадскай маёмасці.

Актыў пастанавіў значна ўзмацніць палітыка-выхаваўчую работу ў інтэрнатах, расшырыць яе маштабы. Адзначыўшы станоўчую работу студсавета інтэрната № 1, пастанавілі правесці абмен вопытам паміж студсаветамі інтэрнатаў, удасканальваць і пашыраць метады работы са студэнтамі.

**М. МІХАЙЛАЎ.**
(Прэс-цэнтр прафкома).

## ЗВАРОТ

**студэнцкага будаўнічага атрада імя акадэміка М. М. Нікольскага Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна да байцоў Усесаюзнага студэнцкага будаўнічага атрада імя Ленінскага камсамола.**

З гневам і абурэннем даведаліся савецкія людзі аб наглым, вераломным нападзе кітайскіх мілітарыстаў на Сацыялістычную Рэспубліку В'етнам. Гэты агрэсіўны акт выкрывае гегеманісцкую, вялікадзяржаўна-шавіністычную палітыку пекінскіх лідэраў. Паследышы крывавага дыктатара Мао груба парушаюць нормы міжнароднага права, дзейнічаюць насуперак духу разрадкі, падтрымання міжнароднага міру, бяспекі народаў. У КНР узведзен у ранг канстытуцыйнага палажэння тэзіс аб фатальнай немінучасці новай сусветнай вайны. У асноўным законе дзяржавы змешчан заклік берагчы збожжа, рыхтавацца да вайны, рэальным праціўнікам у якой нібы выступіць Савецкі Саюз — апора міру ва ўсім свеце. Масавы ваенны псіхоз, грубы антысаветызм не толькі атручваюць унутраную атмасферу ў Кітаі, але і выступаюць рэзкім дысанансам палітыцы краін сацыялістычнай садружнасці.

Верныя прынцыпам пралетарскага інтэрнацыяналізму, сацыялістычныя краіны пастаянна былі і будуць на баку ахвяр агрэсіўных імкненняў міжнароднага імперыялізму і пекінскіх раскольнікаў. Гэта пазіцыя знайшла сваё адлюстраванне ў Заяве Савецкай дзяржавы. У гэтым дакуменце указваецца, што Савецкі Саюз выканае абавязацельствы, узятыя па Дагавору аб дружбе і супрацоўніцтве паміж СССР і СРВ.

Гераічны в'етнамскі народ прайшоў суровую школу барацьбы супраць японскага мілітарызму, французскага і амерыканскага імперыялізму. Вынікі крывавых бітваў з ворагамі свабодалюбівага В'етнама пераканаўча даказваюць, што народ, які пазнаў перавагі сацыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу, перамагчы нельга. У ходзе новага жыцця, якое стала рэальнасцю пасля жнівеньскай (1945 г.) рэвалюцыі, сфарміраваўся в'етнамскі народ — народ-герой, народ-волат, народ-працаўнік, народ, непераможны ў ліхалецці.

Справай прынцыпу, пераканання і пачуцця для нас з'яўляецца ўсямерная дапамога В'етнаму. Савецкім людзям добра вядома, што нясуць у сабе агрэсіўныя падкопы. Наш народ аддаў 20 мільёнаў жыццяў у імя барацьбы з жахлівым параджэннем міжнароднага імперыялізму — германскім фашызмам. Актыўныя, упартыя пратэсты савецкіх людзей супраць кітайскай агрэсіі, такім чынам, зразумелыя. Цяпер, калі в'етнамская зямля зноў акрываўлена, наш розум і сэрцы глыбока закранаюць трывожныя сігналы з гэтага раёна.

Выхаваная на рэвалюцыйных, інтэрнацыяналістычных традыцыях, савецкая моладзь заяўляе аб сваёй шчырай і гарачай падтрымцы справядлівай барацьбы в'етнамскіх патрыётаў.

Усямерная дапамога в'етнамскаму народу — святы, інтэрнацыянальны абавязак савецкай моладзі.

Мы, байцы СБА імя акадэміка М. М. Нікольскага, заклікаем байцоў Усесаюзнага СБА імя Ленінскага камсамола правесці ў падрыхтоўчы перыяд камуністычны суботнік салідарнасці з сацыялістычным В'етнамам, пералічыўшы заробленыя сродкі ў фонд дапамогі народу Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам.

Рукі прэч ад сацыялістычнага В'етнама!

Заклік прынят аднагалосна на сходзе СБА імя акадэміка М. М. Нікольскага 22 лютага 1979 года.

Зварот адобран і падтрыман байцамі зводнага студэнцкага атрада БДУ імя У. І. Леніна.

# КОНКУРС ЗАВЕРШАН... КОНКУРС ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ДВАНАЦЦАЦЬ год назад ЦК ВЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР прынялі рашэнне аб правядзенні першага Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх работ па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечанага 50-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. За мінулы час конкурсы сталі неад'емнай часткай ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў, садзейнічалі выпрацоўцы ў іх творчага падыходу да аналізу грамадскіх з'яў. Аб масавасці іх гаворыць хаця б той факт, што з пачатку правядзення конкурсаў у іх прыняло ўдзел звыш 8 мільёнаў студэнтаў усіх форм навучання.

Такі інтарэс будучых спецыялістаў да вывучэння грамадскіх навук не выпадковы. Як адзначаў у сваім выступленні на XVIII з'ездзе ВЛКСМ Л. І. Брэжнеў, «кожны малады ленінец павінен быць актыўным палітычным байцом, здольным на справе праводзіць палітыку партыі і весці непрымірымую барацьбу з варожай ідэалогіяй». Рэалізацыі гэтай задачы і прысвечана правядзенне аглядаў студэнцкіх работ па грамадскіх навуках.

Не стаў выключэннем і VII конкурс, вынікі якога былі падведзены на канферэнцыі, якая прайшла нядаўна ў Валгаградзе. У ліку дэлегатаў былі і студэнты БДУ.

Бадай, найбольшы поспех выпаў на долю студэнта IV курса гістфака Аляксандра Шлопака. Выкананая ім работа «Кампартыя Беларусі — арганізатар спаборніцтва мас за паспяховае выкананне планаў дзесятай пяцігодкі ў галіне прамысловасці» ўдастоена дыплома І ступені, а аўтар прэміраваны турысцкай паездкай у ГДР. Першае, што кідаецца ў вочы пры знаёмстве з рэфератам, — высокі навуковы ўзровень пастаноўкі і рашэння праблемы. А. Шлопак не толькі абагульняе перадавы вопыт, назапашаны партыйнымі арганізацыямі рэспублікі ў справе мабілізацыі працоўных на паспяховае выкананне планаў дзесятай пяцігодкі, але і выказвае шэраг практычных рэкамендацый. Актуальнасць гэтай работы абумоўлена і тым, што пастаўленыя пытанні разглядаюцца аўтарам у цеснай сувязі з барацьбой працоўных рэспублікі за дастойную сустрэчу 60-годдзя БССР і Камуністычнай партыі Беларусі.

Вялікую цікавасць выклікаў рэферат студэнткі III курса гістфака Ганны Хацкевіч «Ф. Э. Дзяржынскі на чале барацьбы з дзіцячай безнагляднасцю (1921—1923 гг.)». У ім аналізуецца сапраўды вялікая работа, праведзеная Феліксам Эдмундавічам у Камісіі па паляпшэнню жыцця дзяцей пры УЦВК. У рабоце ўмела выкарыстан вялікі фактычны матэрыял — пісьмы Ф. Э. Дзяржынскага да сястры Альдоны Эдмундаўны, дзённік, які ён вёў у турэмных казематах варшаўскай цытадэлі, успаміны яго сына — Яна Феліксавіча Дзяржынскага.

Адной са слаўных старонак у летапісе нашай рэспублікі прысвечана даследаванне Наташы Царук. Яна звярнулася да перыяду Вялікай Айчыннай вайны, да дзейнасці Камуністычнай партыі па арганізацыі палітычнай работы ў тыле ворага сярод насельніцтва часова акупіраваных заходніх абласцей Беларусі. Яе работа таксама ўдастоена дыплома ўсесаюзнага конкурсу.

Усё ўзрастаючае значэнне на сучасным этапе набывае барацьба супраць буржуазнай ідэалогіі і антыкамунізму. Рэзкая водпаведзь тым, хто імкнецца пасеяць раздор паміж народамі, пабудаваць штучныя перашкоды на шляху разрадкі міжнароднай напружанасці, змяшчаецца ў даследаванні будучага гісторыка Люды Валюк — аўтара работы «Ідэалагічная барацьба ў час правядзення II этапа Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе». Падрыўная дзейнасць рознага роду ўльтралевых і мааісцкіх арганізацый выкрываецца ў рабоце Анатоля Разанава. Абодва рэфераты напісаны на падставе вывучэння вялікай колькасці літаратуры.

Дыпломы атрымалі таксама студэнты М. Залескі і В. Макарычава. Многія ўдзельнікі конкурсу ўзнагароджаны граматамі.

Радасна, што разам з савецкай моладдзю актыўны ўдзел у конкурсе прынялі і замежныя студэнты, якія навучаюцца ў БДУ. Двое з іх — Міраслаў Патэк і Яраслаў Гамолік з Чэхаславакіі — увайшлі ў лік пераможцаў. Работа будучых фізікаў «Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і рэвалюцыйны рух у Чэхаславакіі» адзначана дыпломам конкурсу. А ўсяго трынаццаць работ студэнтаў БДУ — больш, чым у любой іншай ВНУ рэспублікі, — былі заахвочаны па выніках усесаюзнага агляду.

Гэты поспех не выпадковы. Ён з'явіўся вынікам той пастаяннай увагі, якая ўдзяляецца навуковай рабоце студэнтаў з боку кафедр грамадскіх навук, рэктарата, партыйнага і камсамольскага камітэтаў ВНУ. Вялікая заслуга ў гэтым і навуковых кіраўнікоў лепшых работ: прафесараў У. М. Сікорскага, І. В. Царук, дацэнтаў і выкладчыкаў Я. В. Петушковай, Г. А. Калінінай, Л. П. Максімавай, Я. Л. Прыбытковай і іншых. Разам з тым належыць адзначыць і недахопы ў падрыхтоўцы да конкурсу, галоўным з якіх з'яўляецца тое, што работы, адзначаныя на ўсесаюзным аглядзе, маюць, як правіла, «гістарычную» прапіску. Такія факультэты, як юрыдычны, прыкладной матэматыкі і шэраг іншых, не змаглі прадставіць на ўсесаюзны тур ніводнай работы. Недастаткова прыцягваюцца да ўдзелу ў конкурсах і студэнты вячэрняй формы навучання. А ў расшырэнні геаграфіі конкурсу, ва ўмелым выкарыстанні наяўных рэзерваў — залог будучых поспехаў.

Конкурс завершан... Конкурс працягваецца. Закрываючы канферэнцыю, намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР М. І. Мохаў, сакратар ЦК ВЛКСМ А. В. Жуганаў не толькі адзначылі поспех мінулага агляду, але і заклікалі ўсе калектывы ВНУ, камсамольскія арганізацыі разгарнуць работу па падрыхтоўцы да чарговага, VIII конкурсу, які пройдзе ў 1979 — 1981 гг. і будзе прысвечан 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. Для паспяховага ўдзелу ў ім кафедрам грамадскіх навук, СНТ, камсамольскай арганізацыі БДУ патрэбна ўжо зараз прадумаць тэматыку конкурсных работ, прыцягнуць да работы над імі лепшых студэнтаў. Час не чакае.

**С. ЯЦКЕВІЧ,**
аспірант кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў.

# Твая актыўная пазіцыя

Ідзе грамадска-палітычная атэстацыя і Ленінскі залік у камсамольскіх арганізацыях факультэтаў. Ужо першыя вынікі сведчаць аб тым, што камсамольцы аднесліся да гэтай справы з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю.

Асабліва добрыя паказчыкі ў хімікаў. Трэцяя і пятая акадэмічныя групы І курса, першая, другая і трэцяя групы II курса, другая і трэцяя групы III курса, групы паўправаднікоў, фізічнай хіміі, ВМЗ і арганічнай хіміі IV курса паказалі добрае веданне асноў агульнаадукацыйных і спецыяльных дысцыплін, ідэйна-палітычную падрыхтоўку. Як правіла, значкістамі Ленінскага заліку сталі тыя, хто старанна рыхтуецца да заняткаў, наведвае лекцыі і практычныя, удзельнічае ў грамадскім жыцці факультэта. Сярод іх В. Бурць, Г. Андраюк, В. Мацукевіч, В. Ярмоленка і іншыя.

Грамадска - палітычная атэстацыя — гэта свайго роду праверка гатоўнасці студэнта да грамадскай работы, праверка яго самастойнасці, эрудыцыі. На фізічным факультэце лепшай лічыцца першая група II курса. Па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі яна лідзіруе і цяпер у яе лепшыя паказчыкі атэстацыі. Выдатнікам заліку стаў стараста патока, выдатнік вучобы В. Белы. Добра сябе зарэкамендавалі студэнты Г. Васілёнак, А. Лаўрыненка, І. Кузьмін, І. Сташкевіч.

Праўда, ёсць на факультэце і недахопы. Напрыклад, няяўка на залік без уважлівых прычын і, вядома, самы значны, які заўсёды цягне групу назад, — гэта акадэмічная запазычанасць. На факультэце робіцца ўсё магчымае, каб ліквідаваць іх.

А на гістарычным факультэце пакуль што лепшай лічыцца чацвёртая група II курса аддзялення гісторыі. Тут усе студэнты атрымалі Ленінскі залік. Выдатнікам заліку сталі Л. Гулевіч, М. Масючэнка, М. Даўгела і іншыя.

Добрыя вынікі атэстацыі і на чацвёртым курсе. Значкістамі тут сталі Л. Боканава, Н. Застаўнюк; на трэцім курсе аддзялення філасофіі — І. Голубева, В. Валканацкі і іншыя.

Студэнты другой групы чацвёртага курса механіка-матэматычнага факультэта адзначылі, што ў апошні час значна павысілася грамадская актыўнасць камсамольцаў. Юнакі і дзяўчаты не толькі цікавяцца жыццём сваёй групы, але і ўдзельнічаюць ва ўсіх камсамольскіх справах факультэта. Выдатнымі арганізатарскімі якасцямі валодаюць Т. Любушкіна, Т. Давыдзік, Г. Глобуз. Яны — камсамольскія актывісты факультэцкага маштабу. У рабоце групы «Пошук» мехмата прымаюць удзел Л. Альховік і А. Жыбко, членам рэдкалегіі «Камсамольскага пражэктара» з'яўляецца У. Міцюшаў, А. Суржанскі ўваходзіць у састаў факультэцкай агітбрыгады.

Усё гэта адзначыла камісія і ацаніла вынікі грамадскай работы 10 студэнтаў групы на выдатна, 7 — на добра, 4 — на здавальняюча. У заключэнне камсамольскага сходу камісія пажадала чацвёртакурснікам працаваць яшчэ актыўней.

Грамадска - палітычная атэстацыя і Ленінскі залік працягваюцца.

**Л. ЖЫЛІНСКАЯ.**

# НАШЫ БЛІЖЭЙШЫЯ ЗАДАЧЫ

Вынікам зімовай экзаменацыйнай сесіі і задачам калектыву выкладчыкаў і студэнтаў на другое паўгоддзе 1978-79 навучальнага года быў прысвечан савет факультэта журналістыкі. З дакладам на савеце выступіў дэкан факультэта журналістыкі прафесар Р. В. Булацкі. Ён адзачыў, што ў першым семестры 1978—79 навучальнага года калектыў факультэта ўсю навуковую, палітыка-выхаваўчую і культурна-масавую работу праводзіў у адпаведнасці з рашэннямі партыі і ўрада аб вышэйшай школе. Асаблівая ўвага звярталася на ажыццяўленне пастановы ЦК КПСС ад 20 студзеня 1975 года «Аб мерах паляпшэння падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў» і іншых партыйных дакументаў.

Ва ўмовах усеагульнага палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага падрыхтоўкай да святкавання 60-годдзя БССР і КПБ, праходзіў першы семестр. Калектывам факультэта былі ўзяты дадатковыя сацыялістычныя абавязацельствы, якія паспяхова выкананы.

Значна палепшылася вучэбна-метадычная работа, шмат зроблена па стварэнню індывідуальнага плана для факультэта, які найбольш поўна ўлічвае спецыфіку падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у нацыянальнай ВНУ.

Дакладчык адзначыў, што ў цэлым па факультэту паспяховасць у зімовую экзаменацыйную сесію 1978—79 навучальнага года, як і ў мінулыя гады, дастаткова высокая.

Пастаянная ўвага ўдзяляецца на факультэце навукова-даследчай рабоце. Кафедры ў бягучай пяцігодцы вырашылі пазбавіцца ад шматтэм'я ў навуковых даследаваннях і, выконваючы рашэнні XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ, сканцэнтравалі ўвагу на вырашэнні найбольш актуальных праблем нашага жыцця.

На факультэце працуе студэнцкае навуковае таварыства. У яго саставе 5 гурткоў: гісторыі журналістыкі, публіцыстыкі, крытыкі, радыёвяшчання і тэлебачання. Нядаўна пачаў работу гурток эканомікі. За апошні час павялічылася не толькі колькасць прадстаўленых на рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых работ і колькасць дакладаў, прачытаных на канферэнцыях, але і колькасць работ І і II катэгорый.

Належная ўвага на факультэце ўдзялялася палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай рабоце, якая вялася ў адпаведнасці з планамі дэканата, партыйнага бюро, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый.

Але ў рабоце факультэта ёсць яшчэ нявыкарыстаныя рэзервы для далейшага паляпшэння падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў, павышэння іх прафесіянальнага майстэрства. Так, не ўсе магчымасці былі выкарыстаны для таго, каб забяспечыць высокі конкурс на факультэт у час уступных экзаменаў. Не поўнасцю адпавядае патрабаванням часу наяўная матэрыяльная база.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел загадчыкі кафедр Б. В. Стральцоў, М. Я. Цікоцкі, Я. Р. Радкевіч, сакратар партыйнага бюро А. А. Рудэнка, прафесары Е. Л. Бондарава, В. А. Пыжкоў і іншыя.

На савеце выступіў рэктар БДУ імя У. І. Леніна, акадэмік АН БССР У. А. Белы. Ён зрабіў слушныя заўвагі па паляпшэнню падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў, адказаў на шматлікія пытанні прысутных.

У рабоце савета прынялі ўдзел сакратар парткома універсітэта дацэнт М. С. Гарашчук і прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар У. Р. Івашын.



Па-сапраўднаму вясновы настрой у Таццяны Жарко, студэнткі II курса вячэрняга аддзялення механіка-матэматычнага факультэта. Вынікі вучобы і працы ў вылічальным цэнтры БДУ прыносяць ей задавальненне.

Фота **А. Русаковіча.**

НА КОНКУРС

# НЕ СПЫНЯЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ

ДВАНАЦЦАЦЬ год інтэрнат № 1, дзе пражываюць пераважна студэнты гістарычнага факультэта, займае першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве сярод інтэрнатаў БДУ імя У. І. Леніна. Чым абумоўлены поспех? Для таго, каб даць адказ на гэта пытанне, я рашыў наведаць інтэрнат і пагутарыць з яго жыхарамі.

Штогод пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва да ўсіх інтэрнатаў прад'яўляюцца аднолькавыя патрабаванні. Тут важна ўсё: і работа студсавета, і службы забеспячэння, і каменданцкая дзейнасць, і актыўнасць саміх студэнтаў і г.д. Поспех звычайна спадарожнічае там, дзе добра наладжаны справы.

На мой погляд студэнцкі савет нясе на сваіх плячах асноўны цяжар, і таму я паведу размову іменна аб яго дзейнасці. Узначальвае студсавет Андрэй Гарбацкі, чалавек, які паспяхова кіруе не толькі гэтым параўнальна невялікім калектывам, а і ўсім шматлікім насельніцтвам інтэрната наогул і спалучае сваю дзейнасць з добрай і выдатнай вучобай на факультэце.

У пакоі студсавета вывешаны інструкцыі і палажэнні аб дзяжурстве па інтэрнату, правілы паводзін студэнтаў. В. Дабравольскі, адказны за гэту работу, заўсёды своечасова праводзіць інструктаж з дзяжурнымі, сочыць за выкананнем імі сваіх абавязкаў. Адсюль і адсутнасць грубых парушэнняў сацыялістычнага супольнага жыцця.

Што датычыць культурна-масавай работы з савецкімі і замежнымі студэнтамі, якія пражываюць у інтэрнаце, то яна таксама на высокім узроўні. Тут патрэбна адзначыць работу студэнткі ІІ курса аддзялення філасофіі С. Марозавай. Да сваіх абавязкаў яна заўсёды адносіцца сур'ёзна. Святлана праводзіць вялікую прапагандысцкую работу па арганізацыі мастацкай самадзейнасці і вечароў адпачынку, прысвечаных важнейшым датам у жыцці слаўнай савецкай камсамоліі, а таксама вечароў інтэрнацыянальнай дружбы. За прайшоўшы навучальны год праведзена 6 вечароў адпачынку з канцэртамі мастацкай самадзейнасці.

Нядрэнна абстаяць справы і са спартыўна - масавай работай. Спаборніцтвы па шашках, шахматах і футболу — з'ява даволі частая. У зімовы час папулярным з'яўляецца мініфутбол. Зараз студэнты рыхтуюцца да спаборніцтваў па настольнаму тэнісу. Аб высокім узроўні спартыўна-масавай работы гаворыць і тое, што па выніках мінулага навучальнага года гістфак заняў другое месца ў агульнауніверсітэцкай спартакіядзе, а інтэрнату было прысуджана трэцяе месца. Рэгулярна працуе інтэрнацкі радыёвузел. Яго работу немагчыма сабе ўявіць без энергічнага і працаздольнага студэнта Юрыя Шаплыкі.

«Гаворыць студсавет» — гэтай перадачай завяршаецца кожнае пасяджэнне студсавета. Кожны чацвер гучыць радыёгазета, у якой паведамляецца аб студэнцкім жыцці, гучаць песні на розных мовах планеты, якія падбіраюцца з улікам попыту савецкіх і замежных студэнтаў. Акрамя гэтага, кожную раніцу гучыць перадача «Трыццаць хвілін з песняй», а ў выхадныя дні — музычны калейдаскоп.

Інтэрнат я неадназова наведваў і ў той час, калі ўсе студэнты былі дома. Але мне так і не прыйшлося адчуць, што калектыў інтэрната мнагалюдны. Тут панавала цішыня, якраз тая, якая так неабходна для добрага працоўнага настрою студэнта. Што і казаць, у многіх інтэрнатах даводзілася пабываць, але такі дысцыплінаваны калектыў сустрэў упершыню. А можа якраз гэта і дапамагло гістфакаўцам заняць другое месца па выніках мінулай сесіі? І тут ёсць над чым задумацца.

Наведаў я таксама і некалькі пакояў інтэрната. Усюды чысціня, парадак. А такія пакоі, як 13, 53, 65, 112, з'яўляюцца гонарам інтэрната. Па выніках многіх рэйдаў і праверак гэтыя пакоі неаднаразова прызнаваліся лепшымі на сваіх паверхах і ўзнагароджваліся тэлевізарамі. Такая ж узнагарода ўручаецца і лепшаму паверху. З адказнасцю да выканання сваіх абавязкаў адносіцца члены студсавета: адказны за санітарна - бытавы стан інтэрната А. Новік, аператыўны атрад на чале з В. Талайка ў саставе 15 чалавек, савет па рабоце ленінскіх пакояў і сектар насценнага друку, які ўзначальвае С. Вяршынін. Гэта далёка не поўны пералік абавязкаў, з якімі паспяхова спраўляецца студсавет.

Вялікая ўвага ўдзяляецца ідэйна - палітычнаму выхаванню. Лекцыі аб міжнародным становішчы, аб унутранай і знешняй палітыцы КПСС на сучасным этапе часта чытаюць у інтэрнаце выкладчыкі кафедры новай і навейшай гісторыі.

Апраўдвае сябе і такая форма работы, як шэфства выкладчыкаў факультэта над інтэрнатам. Для гэтага на факультэце створан савет выкладчыкаў. Асабліва вялікую дапамогу аказваюць Н. Ганчарова, А. Кляцкоў.

Іменна дзякуючы добра наладжанаму спаборніцтву і цеснай узаемасувязі ўсіх бакоў работы са студэнтамі інтэрната поспех надоўга замацаваўся за інтэрнатам гістфака. Калектыў інтэрната неаднаразова ўзнагароджваўся ганаровымі граматамі і пераходным Чырвоным сцягам універсітэта.

А. Гарбацкі ў сувязі з гэтым сказаў, што калектыў інтэрната не спыніцца на дасягнутых выніках і будзе дабівацца новых і новых поспехаў у спаборніцтве. І ён меў на гэта рацыю. Інтэрнат жа далёка не з новых. Вось і на гэтым прыкладзе можна пераканацца, што ўся справа ў канчатковым выніку залежыць ад агульных намаганняў калектыву. І тут ёсць чаму павучыцца ў гісторыкаў.

А. ХАЛЕЦКІ.
(Прэс-цэнтр прафкома).

# ЗАЎСЁДЫ ЖЫВЫЯ

**Выдавецтва ЦК ВЛКСМ ««Молодая гвардия» выпусціла нямала літаратуры аб жыцці, працы, барацьбе камсамольцаў усіх пакаленняў.**

**Аб гераічных справах выхаванцаў Ленінскага камсамола расказваюць кнігі серыі «Твае героі, камсамол». Першая кніга — «Саша Чакалін» С. Смірнова выйшла ў 1967 годзе. Імя школьніка, разведчыка партызанскага атрада, які дзейнічаў у акрузе маленькага гарадка на р. Ака, — Ліхвіна добра нам вядома.**

**Артылерыст Сяргей Махалаў вываў крыху больш двух год. Трынаццаць танкаў падбіў ён толькі ў адным баі, застаўшыся хутка пасля пачатку бітвы адзін з усяго разліку. За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання ён удастоен звання Героя Савецкага Саюза. Кніга В. Лапіна «Сяргей Махалаў» (1969) — аб сіле і мужнасці камсамольца, аб тым, як ваяваў ён і яго таварышы, як дапамагалі яны адзін аднаму ў суровай барацьбе з ворагам.**

**Трэцяя кніга серыі — аб гераіні калгасных палёў, адной з першых жанчын-трактарыстак у нашай краіне — Праскоўі Мікітаўне Ангелінай. Усё яе жыццё — прыклад служэння народу. Аб гэтым гаворыць пісьменнік А. Мусатаў у кнізе «Паша Ангеліна» (1971).**

**Пра гераічнае жыццё члена ЦК камсамола Латвіі, Героя Савецкага Саюза Іманта Судмаліса напісана кніга І. Галасоўскага «Чалавек з Ліепаі» (1972). У буржуазнай Латвіі быў у радах падпольнай арганізацыі камуністычнай моладзі, разам з іншымі камсамольцамі змагаўся з рэжымам Ульманіса. Пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён застаўся працаваць у падполлі ў Рызе і загінуў за год да перамогі ў кратах гестапа.**

**Выхаванец камсамола, Уладзімір Маладцоў (В. Голанд, В. Жаўтоў. «Уладзімір Маладцоў», 1974) у пачатку вайны быў накіраван камандаваннем у Адэсу для арганізацыі барацьбы з акупантамі. У адэскім падполлі, у катакомбах змагаўся У. Маладцоў і яго таварышы.**

**У 1977 годзе выйшла кніга В. Дарафеевай і В. Дарафеева «439 мінут «Сірыуса» — аб першых савецкіх даследчыках стратасферы. «Сірыус» — пазыўны экіпажа стратастата «Асаавіяхім-І», на якім 30 студзеня 1934 года камандзір П. Федасеенка, інжынер-канструктар А. Васенка і вучоны-фізік І. Усыскін упершыню ў свеце ўзняліся на вышыню 22.000 метраў.**

**Яшчэ адна кніга серыі выйшла ў 1978 годзе. Гэта дакументальная аповесць «Мажайскі кірунак» В. Успенскага. Героі яе — Зоя Касмадзям'янская, В. Валошына і іншыя камсамольцы, якія ў першыя гадзіны і дні вайны звярнуліся ў ваенкаматы і райкомы камсамола з просьбай накіраваць іх на фронт. З маладых добраахвотнікаў былі сфарміраваны атрады, якія ў час цяжкіх баёў пад Масквой адважна дзейнічалі ў тыле ворага.**

**Н. ЖУКАВА,**
**студэнтка журфака.**

# ВУЧОБА ПРАФСАЮЗНАГА АКТЫВУ

Нядаўна Мінскі абласны савет прафсаюзаў праводзіў вучобу прафсаюзнага актыву ВНУ г. Мінска, на якой праходзілі практычныя заняткі. У БПІ — грамадскіх кантралёраў, у РТІ — спартыўна-аздараўленчай камісіі, у педінстытуце імя А. М. Горкага — жыллёва-бытавой камісіі, у БДУ імя У. І. Леніна — культурна-выхаваўчай камісіі. Вучоба прайшла арганізавана і цікава. Прадстаўнікі ВНУ горада падзяліліся вопытам работы, падрабязна азнаёміліся са справамі, каб потым скарыстаць у сябе станоўчыя метады. Цёпла сустрэлі ўдзельнікі вучобы студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта БДУ, якія далі канцэрт.

Пасля вясёлых студэнцкіх канікулаў была праведзена вучоба прафсаюзнага актыву універсітэта. Удзельнікі вучобы прааналізавалі вынікі работы за прайшоўшы семестр. У чым дасягнуты поспех, дзе пралікі? Таксама былі намечаны задачы на наступны семестр.

У план вучобы ўваходзіла тэарэтычная частка. Выступіла старшыня праўлення клуба мастацкай самадзейнасці універсітэта Д. Тыцюк. Тэма яе выступлення — «Прафсаюзныя арганізацыі і мастацкая самадзейнасць БДУ».

Аб задачах і змесце культурна-масавай работы ў БДУ расказаў намеснік старшыні прафкома універсітэта В. А. Бяляеў.

На вучобу быў запрошан супрацоўнік АБСХЛ Валерый Круглоў. Ён выступіў перад грамадскімі кантралёрамі.

Падзяліўся вопытам работы Л. Бялевіч — старшыня прафкома філалагічнага факультэта. Аб днях мехмата, іх правядзенні і арганізацыі паведаміў І. Гром.

У заключэнне выступіла агітбрыгада мехмата «Ваганты».

М. ЛАХВІЧ.
(Прэс-цэнтр прафкома БДУ).

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

# ЦЯЖКІЯ КІЛАМЕТРЫ

АДЗІН за другім стартуюць лыжнікі. Дзве тонкія палоскі лыжні, слізгаючы між бяроз, махнатых елак, імкліва нясуць наперад. Круты спуск, пад'ём, моцныя штуршкі палкамі. Зноў пад'ём, нечаканы паварот убок. Галоўнае, утрымацца на нагах, бо хуткасць такая вялікая, што цяжка сачыць за капрызамі лыжнай трасы.

Стомленасць навальваецца на плечы, марознае паветра апальвае вусны. Але лыжнік ведае, што ён адзін-на-адзін з лыжняй. І калі не выкладзеш поўнасцю на дыстанцыі, не стаміўся — значыць не перамог...

Першынство БДУ на лыжных гонках, якое ўваходзіць у праграму XXVIII спартакіяды універсітэта, сабрала вялікую колькасць удзельнікаў. Звыш ста дваццаці чалавек, прадстаўнікоў адзінаццаці факультэтаў, павялі ўпартую барацьбу за званне пераможцаў на лыжнай трасе ў Зялёным.

Першы ж дзень спаборніцтваў паказаў, што завяваць гэта званне будзе нялёгка.

...Старт жанчынам на тры кіламетры. Моцна адштурхнуўшыся палкамі, знікае ў снежным тумане лідэр зборнай універсітэта Генадзія Пятроўская (III курс геафака). Стартавы нумар яе адзінаццаты. Абагнаўшы сваіх папярэдніх саперніц, яна фінішуе першай. Услед за ёю імчыць Галіна Цябус (I курс гістфака). Усяго некалькі секунд уступіла ёй студэнтка V курса юрыдычнага факультэта Тамара Кацар.

Адразу ж за жанчынамі стартавалі мужчыны на дыстанцыі пяць кіламетраў. Першае і другое месца тут у студэнтаў геаграфічнага факультэта Яўгена Горыда і Віктара Казака, трэцяе — у Івана Лапаніка (II курс гістфака).

Другі дзень спаборніцтваў пацвердзіў майстэрства чэмпіёнаў: Генадзія Пятроўская і Яўген Горыд перамаглі адпаведна на пяці-, дзесяцікіламетровай лыжні.

У напружанай барацьбе праходзіла эстафета. Сярод мужчын мацнейшай была каманда фізічнага факультэта, у жанчын — юрыдычнага.

Пасля трох дзён спаборніцтваў першае месца заняла каманда геаграфічнага факультэта. Усяго некалькі ачкоў уступіла ёй каманда юрфака. Трэцяе месца ў лыжнікаў фізічнага факультэта.

Л. ДРАЗДОВА,
студэнтка IV курса журфака.







**На здымках:** пачалася эстафета сярод мужчын; Яўген Горыд, студэнт III курса геафака, стаў пераможцам у гонках на 5 і 10 км; пераможца сярод жанчын у гонках на 3 і 5 км—студэнтка III курса геафака Генадзія Пятроўская. Фота А. Стадуба.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 405. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 03718